**З успамінаў карэннай жыхаркі вёскі Дубраўка Таццяны Ягораўны ТАЛАЛУЕВАЙ (КАЗАКОВАЙ) 1931 года нараджэння:**

*На карте нет моей родной деревни,*
*В моем краю достоинства свои.*
*Весной в цветах качаются деревья,*
*И растревожат душу соловьи.*

Вось ужо трыццаць гадоў мы не чуем гэтага спеву ў роднай вёсцы Дубраўцы. Чернобыльская бяда раскідала яе жыхароў па ўсім свеце. Нават у страшным сне немагчыма было такое прадбачыць, што прыйдзецца пакідаць сваю родную хату і шукаць у іншым месцы прытулак.

Змянілася ўсё наша жыццё, а настальгія па роднай вёсцы не пакідае яе жыхароў па сённяшні дзень. Нашымі песнямі сталі зусім іншыя: «Домик окнами в сад», «Душа болит, а сердце плачет». А вось калі мы жылі ў сваёй вёсцы, то песні былі вясёлыя і жыццярадасныя. Бывала, гуляюць вяселле, то ўся вёска гуляла. Наша Дубраўка стаяла на беразе ракі Дзеражанкі, на стыку трох раёнаў – Касцюковіцкага, Клімавіцкага і Краснапольскага. З захаду блізка была в. Цітаўка Клімавіцкага раёна, а з паўднёвага захаду за 3 км ад нашай вёскі ўжо пачынаўся Краснапольскі раён, туды вяла добрая прасёлачная дарога да вёскі Сасновіца. Калі раніцай у Сасновіцы спявалі пеўні, то было чуваць у нашай Дубраўцы.

З усходу да вёскі падступаў сасновы лес, яго называлі Нямеччынай. У гады вайны 1941-1945 гг. тут людзі рабілі зямлянкі і хаваліся ад налётаў нямецкіх карнікаў. Лес амаль кальцом акружаў нашу вёску: з захаду - Дуброва, з поўначы - Дуброўка, а з поўдня - Дзярбінка. Мясціны тут маляўнічыя, і нідзе такой прыгажосці я не сустракала ў сваім жыцці пасля высялення з роднай вёскі.

Рэчка Дзеражанка пачынаецца з в. Дзеражня Клімавіцкага раёна і ўпадае ў раку Бесядзь. Вада у нашай хуткаплыннай рэчцы была чыстая і празрыстая.

Пачынаючы з мая, пасля пераплаўнай серады і да свята Іллі ў жніўні, дзеці і дарослыя купаліся ў рэчцы. А дзяцей няможна было выгнаць з вады, нават забываліся на абед.

Рэчка была багата рыбай і ракамі, а лес шчодра дзяліўся з людзьмі ягадамі і грыбамі. Кожны год нарыхтоўвалі і сушылі грыбы, збіралі ягады чарніцы, прадавалі дары лесу на базары ў Касцюковічах ці Клімавічах і куплялі дзецям падручнікі ў школу, адзенне, абутак для сям’і.

Да высялення ў нашай вёсцы было 70 двароў, пасвілі два гурты кароў. Сем’і ў вёсцы былі мнагадзетныя па трое-пяцёра дзяцей. Пачатковую школу немцы спалілі яшчэ ў вайну, а пасля вайны пабудавалі школу за 1 км ад нашай, у Скаліне. Каб атрымаць сярэднюю адукацыю, дзеці хадзілі ў Брацькавіцкую школу – гэта за 5 км ад вёскі.

Наталлін равок раздзяляў вёску на дзве часткі. Каля кожнага дома раслі кусты бэзу, на агародах квітнелі яблыні, грушы, вішні, слівы. У кожнай хаце была святая ікона, царквы не было блізка, але дзяцей хрысцілі ў кожнай сям’і, ездзілі і ў Касцюковічы, і ў Клімавічы.

Вясною, калі вада ў рэчцы выходзіла з берагоў, пачыналіся ў школьнікаў канікулы. Наталлін равок таксама бурліў веснавою вадою, і калі залівала масток, то прылёпаўцы былі адрэзаны ад вёскі і хадзілі ў краму ў суседні раён у Сасновіцу.

Зімою прырода была больш суровай, тры месяцы ляжаў снежны пакроў, і толькі ў пачатку сакавіка пачынаў падтайваць снег. Але дзеці рады былі розным зімовым забавам на горках і на рэчцы.

Нягледзячы на тое, што школа была далёка ад нашай вёскі, дзеці імкнуліся да вучобы, амаль палова з усіх вучняў паступілі і скончылі сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Ёсць сярод нашых аднавяскоўцаў настаўнікі -Талалуева Надзея Мікалаеўна, Матарэнка Валянціна Васільеўна, скончыла БДУ Ткачова Зоя Філіпаўна, яна працуе ў Мінску. Фармацэўтам працуе Казакова Людміла Яўгенаўна, бухгалтарамі працавалі Солтанава

Марыя Мікалаеўна, Максіменка Ніна Пятроўна.

Ветурачамі сталі Максіменка Аляксандра Пятроўна, Шурлакоў Мікалай Васільевіч, Шурлакова Валянціна Мікалаеўна, бібліятэчны тэхнікум скончыла Валянціна Мікалаеўна Талалуева.

У 60-я гады жыццё на вёсцы пачало наладжвацца. Была пабудавана малочнатаварная ферма на 150 галоў.
Я там працавала даяркай да выхаду на пенсію. У кожным доме з’явілася электрычнасць. Людзі пачалі набывацьтэлевізары, пральныя машыны, радыёлы і магнітафоны. У нашым клубе была арганізатарам мастацкай самадзейнасці бібліятэкар Паліна Лукінічна Шурлакова. У клубе дэманстраваліся фільмы па выхадных днях. На святочныя даты рыхтавалі канцэрт удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Выязджалі з канцэртамі і ў суседнія вёскі. Пасля канцэртаў наладжваліся танцы пад гармонік Мікалая Гарнастаева і Віктара Яловіка. Было ў клубе шмат моладзі, прыходзілі на танцы хлопцы з суседніх раёнаў, з Сасновіцы і Цітаўкі.

Былі ў нас і музыканты свае, і спевакі выдатныя. «Салаўіны голас» быў у Таццяны Дзмітрыеўны Шурлаковай. На вяселлі ці на іншым святе яна была заўсёды запявалай, а потым песню падхоплівалі іншыя спевакі - Вера Шаталенка, Валянціна Казакова, Клаўдзія Заікіна і іншыя.

А на працы таксама спявалі, бывала, пасе кароў Таццяна Дзмітрыеўна за вёскай на Нямеччыне ды запяе сваю любімую песню «Туман ярам, туман далінаю», то чуваць быў яе голас у Дубраўцы. Вельмі любілі мы слухаць сваю салістку, ды вось так здарылася ў жыцці, што пасля Чарнобыля нас разлучылі на ўсё жыццё са сваімі аднавяскоўцамі. Таццяна Дзмітрыеўна апынулася ва Украіне, у Данецку, дзе зараз ідзе вайна. Ад ваеннага ліхалецця на сваю радзіму няма як прыехаць, бо тут радыяцыйная зона.

Добрым гарманістам у вёсцы быў Мікалай Гарнастаеў. Разам з Таццянай Захараўнай Шурлаковай яны спявалі прыпеўкі.

Здавалася, яны іх ведалі столькі многа, што ніколі не скончацца. Але гэта толькі так было да высялення з Дубраўкі, а прыйшлося кідаць свой новы дом, які Мікалай Гарнастаеў пабудаваў для сваёй сям’і, а жыццё на новым месцы не заладзілася. Не шмат ён пажыў на новым месцы і памёр зусім рана, нават да пенсіі не дажыў.

Сямейная пара Казаковых таксама добра спявала, гаспадар іграў на гармоніку. Яўген Рыгоравіч і Валянціна Аркадзьеўна пасля Чарнобыля пераехалі ў Крычаўскі раён у вёску Луты.

Мая сям'я жыла ў вёсцы заможна, шмат працавалі. Была ў нас пасека, сад, як у Мічурына, дзе на адным дрэве расце некалькі сартоў яблыкаў. Мой гаспадар Мікалай Дзмітрыевіч быў майстрам на ўсе рукі. Цяжка было пакідаць сваю хату ў Дубраўцы, але прыйшлося выехаць, як і ўсім жыхарам. У Клімавічах купілі сабе невялікую хату і 20 сотак зямлі. Гэты ўчастак быў недагледжаны, прыйшлося сваімі рукамі пералапаціць кожны метр зямлі, дапамагалі і дзеці, і ўнукі. Зараз тут вырас сад, і кожны год садзім на агародзе ўсёю сям’ёю агародніну.

Сваю вёску Дубраўку бачу толькі ў снах. Успамінаю сваё маленства і юнацтва, цяжкія пасляваенныя гады, калі прыходзілася працаваць за працадні. Але нягледзячы на ўсе цяжкасці вёска адбудавалася, прыйшлі з вайны не ўсе нашы салдаты. Мой бацька Ягор Казакоў, Філіп Ткачоў, Міхаіл Кузьмянкоў дайшлі да Берліна і вярнуліся дамоў. Бацька быў чалавек вельмі чулы і добры, заўсёды цёпла адносіўся да сваіх родных і іншых людзей. Дома нас бацькі ніколі не білі, словам і добрым прыкладам прывучалі працаваць і не ленавацца.

І вось калі жыццё на вёсцы наладзілася, грымнуў Чарнобыль. Гэта катастрофа, як і вайна, пагнала маіх аднавяскоўцаў з нажытых дамоў у белы свет шукаць новае месца жыхарства. Зараз у нашай Дубраўцы няма ніводнага дома, усё зраўнялі з зямлёю. Цяжка бачыць такую знявечаную родную вёску. Але людзі прыязджаюць сюды на Радаўніцу ці на Тройцу. Толькі з кожным годам сюды дабрацца цяжэй. Рухнуў мост праз рэчку

Дзеражанку, і ніхто не парупіцца, каб яго адрамантаваць.

30 гадоў прайшло пасля аварыі, разруха і запусценне такія, што пасля вайны такога не было. Зарастае наша вёска лесам, і сцежкі-дарожкі да яе таксама зарастаюць. Шмат пытанняў не вырашаецца на сённяшні дзень. Калі будзе бяспечным жыццё на забруджаных тэрыторыях, ніхто пэўнага адказу не можа даць. Чаму так многа людзей хварэюць анкалагічнымі хваробамі не толькі дарослыя, а і малыя дзеці. Вінавата радыяцыя і наша забруджанае харчаванне, але мала дзе пішуць пра бяспечнае пражыванне пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Мне ў гэтым годзе зрабілі аперацыю ў Магілёве ў анкалагічным цэнтры, дыягназ несуцяшальны.
Але гаворка не пра маю хваробу, трэба прадухіліць далейшы рост анкалагічных захворванняў, каб не хварэлі нашы дзеці і ўнукі.

І хто ведае, якія хваробы звязаны з Чарнобылем, а якія не? Анкалагічныя хваробы, як вядома, узнікаюць не проста так, а наша экалогія пасля аварыі не лепшым чынам спрыяе захворванню.

Мы ж не ведалі пра тую небяспеку, што выкіды з рэактара даляцелі да нашай вёскі. Да адсялення мы сеялі і даілі кароў, прадукты былі са свайго агароду, ніхто іх не мераў, колькі там забруджаныя яны былі. Гэта ўжо пасля адсялення людзі пачалі адчуваць уздзеянне радыяцыі на здароўе.

Зараз мы жывём у адносна чыстай зоне, але наступствы аварыі кожны перасяленец адчувае на сабе не лепшым чынам і зараз.

Вырко, Л. Была такая вёска – Дубраўка / Ларыса Вырко // Голас Касцюкоўшчыны.— 2021.— 24 красавіка.— С.6-7.